# З днём нараджэння, дарагі Антон Нікіфаравіч!

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя У. І. ЛЕНІНА

№ 6 (515) Пятніца, 22 лютага 1963 г. Цана 1 кап. Год выдання XVI-ы



*Акадэміку АН БССР, рэктару Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, прафесару*

***СЕЎЧАНКУ Антону Нікіфаравічу***

*ў дзень 60-годдзя з дня нараджэння і 30-годдзя навуковай, педагагічнай і грамадскай дзейнасці*

**19 22/II 63**

**ад калектыву студэнтаў, навуковых работнікаў, аспірантаў, рабочых і служачых Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.**

Дарагі Антон Нікіфаравіч!

У дзень Вашага шасцідзесяцігоддзя з дня нараджэння і трыццацігоддзя навуковай, педагагічнай і грамадскай дзейнасці калектыў студэнтаў, навуковых работнікаў, аспірантаў, рабочых і служачых Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна аднадушна шле Вам, таленавітаму вучонаму і грамадскаму дзеячу, чалавеку вялікай душы і чулага сэрца, свае гарачыя віншаванні і самыя шчырыя пажаданні.

Вы прайшлі вялікі жыццёвы шлях ад настаўніка сельскай пачатковай школы да акадэміка, рэктара буйнейшай вышэйшай навучальнай установы нашай рэспублікі.

Вы належыце да выдатнай кагорты вучоных, якія выраштаны савецкай уладай і ленінскай партыяй камуністаў. Вашы навуковыя працы ў галіне фізікі атрымалі шырокае прызнанне ў нашай краіне і за яе межамі.

Дарагі Антон Нікіфаравіч! Вы ўмела спалучаеце сваю навуковую дзейнасць з педагагічнай, аддаеце многа сіл і энергіі падрыхтоўцы маладых навуковых кадраў. Як глыбокі спецыяліст, Вы групіруеце вакол сябе здольную моладзь, захапляючы яе новымі праблемамі, якія пастаўлены перад савецкай навукай вялікаснай праграмай пабудовы камунізма ў нашай краіне.

Нас радуюць Вашы вялікія клопаты аб расшырэнні вучэбна-матэрыяльнай базы універсітэта, аб умацаванні яго кафедр высокакваліфікаванымі спецыялістамі. Нам блізкія і дарагія Ваша глыбокая партыйнасць, чалавечнасць, сціпласць, Ваша сяброўская чуллівасць і ўвага да людзей.

У Вашай асобе мы віншуем не толькі буйнага вучонага і педагога, але і вялікага грамадскага дзеяча, які прысвяціў сваё жыццё служэнню савецкаму народу.

Мы ад глыбіні нашых сэрцаў жадаем Вам, дарагі Антон Нікіфаравіч, многа, многа сіл і здароўя, доўгіх гадоў жыцця, светлых радасцей, вялікага асабістага шчасця і новых бліскучых поспехаў у Вашай высакароднай працы на карысць нашай цудоўнай Радзімы.

Прарэктар па вучэбнай рабоце Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна **А. Я. МАЛЫШАЎ.**

Сакратар партыйнага камітэта **Т. Я. ДУДАРАВА.**

Старшыня мясцовага камітэта **Ц. Е. САЛАДКОЎ.**

Сакратар камітэта камсамола **Г. Я. РЫЛЮК.**

Старшыня прафсаюзнага камітэта **В. А. МАКАРЭВІЧ.**

# Вучоны, педагог, арганізатар

★

Дацэнт

**Л. В. ВАЛАДЗЬКО,**

дэкан фізічнага факультэта.

★

**У чалавека, які пражыў 60 гадоў, біяграфія не малая, асабліва, калі ён жыў у гушчыні падзей нашага багатага падзеямі стагоддзя. Па кароткіх радках біяграфічнай справаздачы аб жыцці Антона Нікіфаравіча Сеўчанкі можна ўгадаць у ім чалавека энергічнага, чалавека, які мае выдатныя здольнасці, які прайшоў шлях ад простага сялянскага хлапчука да вядомага далёка за межамі рэспублікі і краіны вучонага-фізіка і дзяржаўнага дзеяча. Але біяграфічная справаздача не перадае галоўнай рысы характару нашага юбіляра — яго глыбокай чалавечнасці і прастаты. Такія рысы характару праяўляюцца толькі ў рабоце з людзьмі. І ўсе, хто сустракаецца з Антонам Нікіфаравічам, працуе з ім, вучыцца ў яго, заўсёды адчуваюць яго глыбокую зацікаўленасць у людзях, імкненне дапамагчы ім усімі сваімі сіламі, ведамі, уменнем, вопытам.**

**Адзін з бліжэйшых вучняў Сяргея Іванавіча Вавілава пераняў у свайго настаўніка не толькі пастаяннае імкненне да ўдасканалення сваіх ведаў, але і пачуццё адказнасці за падрыхтоўку новага пакалення высокакваліфікаваных спецыялістаў, за развіццё навукі ва ўсіх яе аспектах, сувязь яе з вытворчасцю, з развіццём народнай гаспадаркі. Менавіта гэта паслужыла падставай для ЦК КПБ у 1952 годзе запрасіць з Дзяржаўнага аптычнага інстытута (г. Ленінград) Антона Нікіфаравіча Сеўчанку на работу ў Мінск. У той час у Беларусі не было ніводнага доктара фізіка-матэматычных навук і толькі 7 фізікаў— кандыдатаў навук. Імклівае развіццё фізікі, гэтай важнейшай галіны чалавечых ведаў, яе пераўтварэнне ў сучасных умовах у адну з форм вытворчай дзейнасці грамадства, выклікалі неабходнасць разгортвання ў рэспубліцы навуковых даследаванняў у галіне фізікі і, адпаведна, падрыхтоўкі дастатковай колькасці спецыялістаў-фізікаў вышэйшай кваліфікацыі.**

**Прыезд на работу ў Мінск дактароў фізіка-матэматычных навук А. Н. Сеўчанкі і Б. І. Сцяпанава выклікаў хуткае развіццё фізікі ў рэспубліцы. У гэтым напрамку праявіліся бліскучыя арганізатарскія здольнасці Антона Нікіфаравіча. У 1953 годзе ў Беларускім універсітэце ствараюцца кафедры фізічнай оптыкі і спектральнага аналізу, а ў Акадэміі навук БССР — сектар фізікі і матэматыкі, які развіўся да цяперашняга часу ў два навукова-даследчых інстытута. Антонам Нікіфаравічам Сеўчанкай апублікаваны 93 навуковыя працы ў галіне яго даследаванняў.**

**Ужо праз пяць гадоў арганізацыі ў БССР даследаванняў па спектраскапіі і люмінесцэнцыі Усесаюзная нарада па люмінесцэнцыі афіцыяльна прызнала ўзнікненне ў рэспубліцы моцнай школы фізікаў- спектраскапістаў, асноўная заслуга ў стварэнні якой належыць акадэмікам А. Н. Сеўчанку і Б. І. Сцяпанаву. У цяперашні час беларускія фізікі ўдзельнічаюць у каардынацыі раду навуковых даследаванняў у саюзным маштабе, выйшлі на арэну міжнародных сімпозіумаў і навуковых канферэнцый.**

**Шмат увагі ўдзяляе Антон Нікіфаравіч умацаванню кафедр універсітэта кваліфікаванымі навуковымі кадрамі, вырошчванню маладых навуковых работнікаў і высокакваліфікаванага выкладчыцкага саставу. Ва універсітэт запрошаны вядомыя прафесары і дактары навук з іншых гарадоў краіны, якія прыступілі да падрыхтоўкі навуковых і педагагічных кадраў як для універсітэта. так і для іншых навучальных устаноў рэспублікі.**

*(Заканчэнне на 2 стар.)*

*З ранку да позняга вечара працягваецца працоўны дзень рэктара. Прыём студэнтаў і выкладчыкаў, работа ў фізічных лабараторыях, чытанне лекцый... Нямала часу адбірае штодзённае знаёмства з багатай універсітэцкай поштай.*

Фота студэнта 2 курса матфака І. Трухана.



# Вучоны, педагог, арганізатар

(Пачатак на 1 стар.)

За час работы ў Мінску дзевяць вучняў Антона Нікіфаравіча паспяхова абаранілі дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдатаў фізіка-матэматычных навук, трое рыхтуюцца да абароны кандыдацкіх дысертацый.

Усім нам добра вядома шасцігадовая дзейнасць Антона Нікіфаравіча на пасадзе рэктара нашага універсітэта. Вялікая настойлівасць і энергія, з якой ён расшырае і ўзмацняе вучэбную і навуковую базу, паляпшае жыллёвыя і бытавыя ўмовы навуковых работнікаў і студэнтаў, вялікая ўвага да патрэб студэнтаў, навуковых работнікаў, рабочых і служачых, аспірантаў універсітэта выклікалі да яго заслужаную павагу і стварылі аўтарытэт і добрага адміністратыўнага кіраўніка. Выключна многа намаганняў патраціў Антон Нікіфаравіч на будаўніцтва і ўвядзенне ў эксплуатацыю галоўнага корпуса універсітэта. З няменшай энергіяй Антон Нікіфаравіч працуе цяпер над будаўніцтвам студэнцкіх інтэрнатаў, над завяршэннем праекта і закладкай новага вучэбнага корпуса радыёфізікі і электронікі.

Навуковая і адміністратыўная дзейнасць Антона Нікіфаравіча цесна спалучаецца з вялікай грамадскай работай. Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР, член ЦК КПБ, ён чула і клапатліва адносіцца да выканання ўсіх паступаючых да яго запатрабаванняў выбаршчыкаў. Яго часта можна бачыць за лектарскай трыбунай, калі ён выступае з паведамленнямі на навуковыя і грамадска-палітычныя тэмы. Працоўныя горада і цяпер вылучылі кандыдатуру А. Н. Сеўчанкі ў Вярхоўны Савет БССР чарговага склікання. Антон Нікіфаравіч неаднаразова прадстаўляў рэспубліку ў міжнародных органах ААН, у прыватнасці ў Агенцтве па выкарыстанню атамнай энергіі ў мірных мэтах.

**У Антона Нікіфаравіча вялікія планы на будучыню. Тут і разгортванне навуковых даследаванняў у новых галінах, і падрыхтоўка дактароў і кандыдатаў навук, і арганізацыя новых вучэбных лабараторый і г. д. Ён паранейшаму бадзёры, поўны сіл і нястомны ў рашэнні пастаўленых задач. Яго энергіі можа пазайздросціць любы малады чалавек.**

**Пажадаем жа яму, у дзень яго 60-годдзя, моцнага здароўя, многіх гадоў жыцця і далейшых поспехаў ў яго шматграннай дзейнасці на блага нашага народа.**

## *Радкі з майго адпачынку*

23 студзеня прыляцеў у Адэсу, дзе жывуць мае бацькі. Адразу ж адправіўся агледжваць горад. Як у песні: «каждой весною всё тянет туда, в Одессу, мой солнечный город...».

Праз некалькі дзён мы з сябрам на машыне адправіліся ў падарожжа. Наш маршрут быў такі: Адэса—Тыраспаль—Бендэры—Кішынёў—Дубасарская ГЭС—Рыбніца—Каменка—Вініца.

Калі мы вярнуліся ў Адэсу, мы зноў накіраваліся ў дарогу, на гэты раз у Нікалаеўскі порт. На поўдні была сапраўдная вясна: разліліся рэкі, вада затапіла нізкія мясціны. Таму нам давялося з машынай пагараваць. Але мы не сумавалі. І мне вельмі хочацца, каб калі-небудзь зрабіць яшчэ такія падарожжы.

**Віктар Асаулаў.**



# Вынікі зімовай сесіі на геафаку

Закончылася зімовая экзаменацыйная сесія. Перасталі хваляваць студэнтаў экзамены, якія неслі поспехі адным і няўдачы другім. Зноў запоўнены ўсе аўдыторыі. Як заўсёды ажыўленыя і вясёлыя, гатовыя да новых выпрабаванняў студэнты (праўда, не ўсе) задаволены вынікамі мінулай сесіі. І сапраўды. Вынікі экзаменацыйнай сесіі самі за сябе гавораць, што студэнты геаграфічнага факультэта больш сур'ёзна адносліся да экзаменаў, чым у мінулым годзе.

Студэнты- выпускнікі паказалі высокія веды па пройдзеных тэмах, і вось вынік: восем выдатнікаў, а сярод іх ужо ў які раз аказваецца Рогач, атрымаўшы чарговыя выдатныя адзнакі. Такі поспех упаўне заканамерны, бо пяцікурснікі атрымоўваюць пуцёўку ў жыццё, а таму трэба як ніколі ўпарта працаваць, павышаць свае веды, якія потым прынясуць вялікую карысць у будучай рабоце.

Калі выпускнікі абрадавалі свой факультэт, то аб першакурсніках гэтага не скажаш. Толькі студэнтка Лазнуха здолела ўсе экзамены здаць на «выдатна». У той жа час сярод першакурснікаў з'явіліся чатыры двоечніка. Як бачна, першакурснікі рашылі па традыцыі не ўступаць пальму першынства ў «хвастызме» на геафаку.

Лепшымі на чацвёртым курсе аказаліся Кірыенка, Гурда, Чаканаў, а на другім — Праўда, Мыслівец, Татура, Ганусевіч. Многім другакурснікам толькі адна чацвёрка ў залікоўцы не дала магчымасці ўвайсці ў лік выдатнікаў.

На трэцім курсе выдатнага поспеху дабілася Мікіцкая. Яна прыйшла на стацыянар з завочнага і адразу ж увайшла ў кагорту лепшых. Хочацца пажадаць ёй і ў далейшым выдатных поспехаў.

Хочацца, каб узяты геафакаўцамі рубеж не заспакоіў студэнтаў, каб сур'ёзныя адносіны да вывучаемых прадметаў сталі здабыткам усіх членаў нашага калектыву. Толькі ўпартай працай можна дабіцца такіх поспехаў, якіх дабіліся нашы лепшыя студэнты. Па меншай меры, трэба дамагацца таго, каб паказчыкі паспяховасці на курсах не ўпалі, а лік выдатнікаў вырас.

Наперадзе — летняя экзаменацыйная сесія. Да яе трэба пачынаць рыхтавацца ўжо цяпер. Толькі гэта дасць магчымасць паспяхова здаць экзамены і перайсці на наступны курс, наблізіцца да сваёй запаветнай мэты.

**Уладзімір СТУПНІКАЎ,**
**студэнт 2 курса геафака.**

# Чаму пустуе ленпакой?

Ленпакой. Па нядзелях і ў свабодны ад заняткаў час сюды спяшаліся дзесяткі студэнтаў. Чыталі вершы, слухалі лекцыі, праводзілі дыспуты, глядзелі тэлеперадачы. Культурнаму адпачынку садзейнічалі і чысціня, і ўтульная абстаноўка.

Вару Бандацкую, студэнтку аддзялення рускай мовы і літаратуры, ведалі і паважалі за яе старанную працу, працу адказнай за ленпакой. Па яе ініцыятыве была створана бібліятэка, якая рэгулярна абменьвала кнігі і часопісы. З рук у рукі пераходзілі акуратныя падшыўкі газет. Увагу студэнтаў пастаянна прыцягвала кніжная вітрына. Вара заўсёды клапацілася аб тым, каб у ленпакоі была спраўная мэбля— сталы, крэслы, канапы. Неяк пры сустрэчы з камендантам Варвара папрасіла яшчэ тое-сёе для ленпакою. Камендант ахвотна выканала яе просьбу.

Пастаянныя турботы Варвары былі не выпадковыя. Інтэрнат змагаўся за першынство ва універсітэце па санітарнаму стану. Бандацкая гэта разумела і аддавала ўвесь свой вольны час. Бывала, скончыўся вечар, усе ідуць спаць, а яна застаецца прыбраць як мае быць пакой.

Аднак пасля падвядзення вынікаў спаборніцтва Вара расчаравалася. І не выпадкова. Аб ёй, як і аб Ліліі Рублеўскай, якая адказвала за першы паверх, проста забылі. Аб сходзе, які падводзіў вынікі спаборніцтва, яны пачулі толькі праз месяц пасля таго, як ён адбыўся.

— Ніхто нават словам не адгукнуўся: дрэнна я працавала ці добра, — пакрыўджана гаварыла Вара.

Сустрэўшыяся нам на лесвічнай пляцоўцы студэнткі сказалі, што гэта спаборніцтва трэба расцэньваць па-іншаму. Многім вынеслі падзякі, іншых — узнагародзілі грашовымі прэміямі. Сярод апошніх аказаліся і тыя, хто да спаборніцтва не меў ніякага дачынення. Такі не вельмі прыгожы канец прыняло спаборніцтва ў мінулым навучальным годзе.

А ў бягучым?

Разам з Варай Бандацкай падымаемся на трэці паверх. Першае, на што звяртаеш увагу — выбітае шкло ля дзверы. Твар у маёй спадарожніцы пахмурнеў, сціснуліся губы.

У ленпакоі — падлога з аблезшай фарбай, брудная і непрыбраная. Мы паспрабавалі вызначыць дату, калі ў апошні раз пакой прыбіраўся, але дарэмна. Паламаныя крэслы валяліся на падлозе, іх дэталі звалены на радыятары, на канапы. Сталы згубілі свой нармальны выгляд. Іх штурхалі ўзад і ўперад, у залежнасці ад таго, у які бок ішоў студэнт. Некаторыя студэнты ляжалі на канапе і пелі песні. Бакавыя катушкі канапы ператварыліся ў футбольны мяч — іх пасавалі з кутка ў куток. У двух шафах, дзе ў мінулым былі кнігі і кожная палічка была акуратна прыбрана, цяпер валяліся канспекты, шматкі газет і падшыўка з двумя-трымя нумарамі газет.

Выхавальная работа ў інтэрнаце вельмі нездавальняюча вядзецца. Выкладчыкі рэдка бываюць тут і мала цікавяцца жыццём і бытам студэнтаў.

Не раскачаўся пасля зімовых канікул і студсавет. А прайшло ж паўмесяца! Ці не надта многа, таварышы студэнты?

**Г. ОГІЙ.**

Інтэрнат № 1.

## *Як назваць гэты здымак?*

*Як назваць гэты здымак, які зрабіў студэнт 1 курса завочнага аддз. журналістыкі Аляксандр Война? Мы звяртаемся да вас, дарагія чытачы, якія будуць вашы прапановы? Лепшую з назваў, якую вы прапануеце, мы вызначаем прызам, які будзе ўручан аўтару назвы праз месяц. Вашы прапановы будуць прымацца рэдакцыяй да 15 сакавіка г. г.*

# *Фізкультура і спорт*

## ФУТБОЛ

Усё бліжэй новы футбольны сезон. Як жа рыхтуюцца да яго футбалісты зборнай універсітэта?

Мінулы сезон паказаў, што ў камандзе дрэнная фізічная падрыхтоўка. А гэта вынік таго, што многія футбалісты пачалі лічыць сябе незамененнымі, пачалі прапускаць трэніроўкі. У цяперашняй перадсезоннай падрыхтоўцы трэнер каманды Віталій Данілавіч Ліштван асобую ўвагу ўдзяляе фізічнай падрыхтоўцы. Заняткі са штангай, бег з паскарэннямі, гімнастычныя практыкаванні — вось далёка не поўны спіс трэніровачных элементаў. Не забыта і работа над тэхнікай.

Рэгулярна наведваюць заняткі студэнт хімічнага факультэта Буткевіч, аспірант Шымановіч, а таксама аўтар гэтых радкоў. Усе трое са зборнай. Разам з юрыстамі Пашковым, Мануйка, хімікам Дзярбінскім, супрацоўнікам геафака Дубікоўскім яны складаюць ядро каманды.

Тыя футбалісты, у якіх была слабая тэхніка, узмоцнена шліфуюць тэхнічныя прыёмы.

На асеннім першынстве горада наша зборная заняла 2 месца. Але ў нас ёсць магчымасці выступаць лепш. Наперадзе адказныя спаборніцтвы: першынство вышэйшых навучальных устаноў Беларусі, першынство горада. Наша задача—быць у ліку прызёраў Белсавета «Буравеснік». А для гэтага трэба трэніравацца з яшчэ большай нагрузкай. У спаборніцтвах на прыз адкрыцця сезона БДУ будзе прадстаўлен двумя камандамі. Так што многія змогуць паспрабаваць свае сілы ў другой камандзе, а гэта — рэзерв першай каманды.

**Аляксандр БЕЖЫК.**

**Рэдактар У. КУЛАЖАНКА**

**Адрас рэдакцыі:**
Мінск Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, 212. Тэл. 2-07-19.

Друкарня Белсаўпрофа.
АТ 04184. Тыр. 2000 Зак. 720.